***А.В. Коваленко***
БГУ (Минск)

# ПАЛІТЫЧНЫЯ І ПРАВАВЫЯ ПОГЛЯДЫ Ф. СКАРЫНЫ (1486(90) – 1551(56)

Гісторыя палітычнай і прававой думкі – гэта адносна новая палітыка-прававая дісцыпліна, якая вывучае палітычныя трактаты і філасофскія сачыненні, выказванні нацыянальных мысліцеляў, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, паэтаў і г. д. аб палітыка-прававых з'явах у розных творах, якія не былі развіты да ўзроўню самастойнай и арыгінальнай тэорыі. Прававая і палітычная думка адлюстроўвае складаныя сацыяльныя, палітычныя, нацыянальныя, рэлігійныя працэсы, якія адбываюцца ў дзяржаве ў той ці іншы перыяд.

Гісторыі вядомы палітычныя и прававыя погляды выразніка інтарэсаў сярэдніх слаёў беларускіх гараджан, зацікаўленых у развіцці буржуазных адносін, буйнейшага гуманіста эпохі Адраджэння Францыска Скарыны. Галоўнай крыніцай для вывучэння светапогляду Ф. Скарыны, ў тым ліку палітычных і прававых ідэй, з'яўляюцца яго прадмовы и пасляслоўі да выдадзеных ім біблейских кніг, у якіх беларускі гуманіст выказаў свае думкі па найбольш актуальных праблемах грамадскага і палітычнага жыцця таго часу.

Светапогляд Ф. Скарыны прасякнуты любоўю да Радзімы. Нацыянальна-патрыятычныя ідэі выказаны гуманістам у такіх паэтычных словах: «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птицы, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають». Значнае месца ў прадмовах и пасляслоўях Ф. Скарына адводзіць палітычным і прававым праблемам. Палітычным ідэалам мысліцеля з'яўляецца асветная, моцная, гуманная манархія, дзе манарх павінен быць набожным, мудрым, моцным, справядлівым да падданых. Перавагу Скарына аддаваў асвечанаму і міралюбіваму гаспадару.

Ф. Скарына быў упэўнены, што падмуркам дзяржавы, якая сёння лічыцца прававаой, з'яўляецца выкананне яе грамадзянамі наступнага пастулата натуральнага права: «Ва ўсім, як жадаеце, каб з Вамі абыходзіліся людзі, так абыходзьцеся і Вы з іми». Праз гэты закон чалавек разумее, што яму не дазволена забойства, пралюбадзейства, нянавісць, зайздрасць і г. д. На думку Скарыны, гэтага маральнага закона было б дастаткова для грамадзян, калі б насельніцтва складалася з адных добрых людзей. Пісаны закон неабходны толькі для злых людзей, каб яны «боячися казни, смирили смелость свою». Выказваючы свае думкі аб заканадаўстве, Ф. Скарына лічыў, што пісаны закон павінен быць прыстойным, справядлівым, карысным чалавеку, зразумелым, адпавядаць часу і звычаям краіны, не дапускаць двухсэнсоўнага тлумачэння.

Выклікаюць цікавасць погляды Францыска Скарыны на класіфікацыю права, якая выкладзена ў прадмове да кнігі "Другі закон Маісееў". Гуманіст падзяляў права на натуральнае, закладзенае ў самой істоце чалавека, і пісанае. Пісанае, ў сваю чаргу, дзялілася на боскае (крыніца — прадпісанні Старога и Новага запаветаў), царкоўнае (пастанаўленні, прынятыя царкоўнай уладай) и земскае. Вялікую ўвагу Ф. Скарына надае земскаму праву. У земскім праве мысліцелям вылучалася паспалітае права, якое ўключала нормы грамадзянскага и сямейнага права, міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское, гандлёвае права.

Скарына таксама разважаў і наконт багатых і бедных. Гуманіст выказваў думку аб неабходнасці пабудовы ўзаемаадносін паміж імі на аснове "братолюбия". Грамадства павінна грунтавацца на міры і згодзе, бо ад апошняй "все доброе всякому граду и всякому собранию приходит", у той час як "незгода бо и наибольшие царства разрушает". Вядомыя погляды Скарыны на рэлігию. Як прадстаўнік свайго часу, мысліцель быў рэлігійным чалавекам, але яго рэлігійнасць не была артадаксальнай. Ён лічыў, што вера – асабістая справа кожнага чалавека, і быў упэўнены, што няма неабходнасці ў пасрэдніку (дзеячах царквы) паміж чалавекам і Богам. На думку Скарыны, у цэнтры ўвагі чалавека павінны быць зямныя інтарэсы, свецкая, грамадская дзейнасць на

карысць дзяржавы і суайчыннікаў. Францыск Скарына выступаў супраць падзелу Хрысціянскай царквы на праваслаўную і каталіцкую. Каментуючы новазапаветныя тэксты, ён падкрэсліваў небаходнасць аб'яднання хрысціян, бо яны маюць адзінага настаўніка – Ісуса Хрыста, які заклікаў жыць у братняй любові, добрых звычаях и супольнай веры. Ні Рымскага Папу, ни Канстанцінопальскага патрыярха нельга лічыць першасвятаром.

У заключэнне неабходна адзначыць, што ўся дзейнасць выдатнага асветніка-гуманіста Францыска Скарыны была накіравана на абсалютызацыю маральнага и прававога фактара у грамадскім жыцці. Ён спрабаваў прывесці грамадскія адносіны ў адпаведнасць з прынцыпамі гармоніі, згоды, раўнавагі, ліквідаваць грамадскія супярэчнасці пры дапамозе разумных рэформаў.